Hety numar z dadatkam: „Выбарная ардынацыя ў самаўрад.“

№ 34(182) Vilnia, 1 śniežnia 1938 h. Hod XI.

Chryścijanskaja DUMKA

BIEŁARUSKI ČASAPIS — VYCHODZIĆ TRY RAZY U MIESIAC

CHRYŚCIJANSTVA — APORA PRAŪDY I SPRAVIADLIVAŚCI

Ciapier taki čas, kali praŭdu i spraviadlivaść znajści na śviecie duža trudna. Ciapier ludzi pieravažna pačali vieryć u siłu, dumajučy i pastupajučy pavodle pahavorki — chto dužšy, toj i lepšy. Ale kožnamu razumnamu i dobramu čałavieku, jakija ŭsio-ž jašče sa śvietu nie źvialisia, dobra viedama, što hetki pahlad susim fałšyvy. Kožnamu takomu čałavieku tak-ža viedama, što hetki pahlad i źjaŭlajecca hałoŭnaj pryčynaj taho strašnaha zła, jakoje tak hłyboka zapuščaje siańnia svajo kareńnie ŭ ludzkoje žyćcio.

Na ščaście praŭda i spraviadlivaść sa śvietu źvieścisia nia mohuć, bo kali ich ludzi ad siabie vyhaniajuć, dyk jany zaŭsiody znachodziać peŭnuju aporu i biaśpiečny prypynak u chryścijanstvie, u Chrystovym Kaściele-Carkvie. Hetaja praŭda siańnia jość duža vidavočnaj.

Biarom u ruki „Wiadomości Literackie" z dnia 27.XI sioleta. Prahladajem artykuł J. Parandoŭskaha — „Myśli o kulturze". Miž inšym u hetym artykule čytajem: ...„Ani fašyzm, ani kamunizm nia moža stać vobak katalicyzmu, katory razlehłaściaj svajej matafizyki (daśledžvańnie sutnaści, pryčyn, pravoŭ i najhłybiejšych padstaŭ bytu — red.), šyrynioj pačućciovaści, vieličaj svaich dačasnych i viečnych namieraŭ śpichaje ich (fašyzm i kamunizm) u rad karotkich i ŭryŭkavych zdareńniaŭ, kali-ž sam jość płyniaj, abličanaj na tysiačahodździ".

Dalej, u tym-ža numary tych-ža „Wiad. Lit." u „Kronice Tygodniovej" spatykajem niešta jašče bolš vyraznaje. Viedamy polski piśmieńnik i myśliciel A. Słonimski miž inšym tam tak piša: „Katalicki Kaścioł, a pradusim sam papież, karystaje z kožnaj nahody, kab zhanić i zaklajmić žorstkaść ašalełaha nacyjanalizmu. U hetaj praŭdzivaj vajnie, u biazžałasnaj vajnie, jakuju Žydom abjavili Niemcy, pa staranie prašledavanych staŭ Rym. Rym nie Mussoliniaha, ale Rym — Apostalskaja Stalica.

Chto viedaje, ci ŭściaž uzrastajučaja žorstkaść nie aćvierazić rešty śvietu, chto viedaje, ci nie nastupić reakcyja ŭ narodach, praŭdziva źviazanych z chryścijanskim ducham, chto viedaje, ci relihijnaść, najšyrej paniataja, nie abudzicca ŭ sercach ludziej, hnanych i ściobanych, jak źviarynaje stada"...

Tym bolš hetyja dva hałasy ab značeńni chryścijanstva adnasna praŭdy i spraviadlivaści cikavyja i važnyja, što abodva hetyja vydatnyja polskija piśmieńniki chryścijanami-katalikami ŭ aficyjalnym razumieńni nie źjaŭlajucca.

Prytačyli my ich dumki tolki jak najśviažejšyja prykłady. Bo-ž i biaz ich my viedajem, što chryścijanstva—heta sapraŭdy adzinaje prypynišča praŭdy i spraviadlivaści. Asabliva heta treba mieć na ŭvazie nam Biełarusam, umiejučy, viedama, adroźnivać chryścijanskuju praŭdu ad ludzkoj u jej, čužoj i jej varožaj, palityčnaj damieški...

* * *

Думкі чорныя, думкі маўклівыя,
Вы як ночка васеньня бурлівыя
Ў маім сэрцы журбой заляглі.
Скуль узяліся, думкі нязнаныя,
Чорным горам, бядою загнаныя,
Што ў грудзёх маіх боль разьлілі?..

АЛЕСЬ СЯРКО

Сухая-Даліна
11.IV.36.

RARATY

za pamysnaść pracoŭnych Biełarusaŭ m. Vilni adbuducca 8.XII sioleta ŭ dzień Niepavinnaj Dzievy Maryi ŭ kaśc. śv. Mikałaja a h. 7 min. 30 rana.

Da viedama padpiščykaŭ i čytačoŭ „CHRYŚCIJANSKAJ DUMKI“

Z Novaha Hodu rychtujemsia vydavać naš časapis ŠTOTYDNIA.
Raz u miesiac budzie dadatak dla dziaciej „ZORKA“.

Usio razam budzie kaštavać u hod 4 załatoŭki; na paŭhoda — 2 zał. na try miesiacy — 1 zał.;

Vinavatych duža prosim piaśpiašycca zapłacić nam doŭh. **Dajom času da 15.I.1939.** Niaprysłaŭšym da hetaha času daŭhu časapis budzie strymany.

Usich padpiščykaŭ prosim prysyłać nam padpisku na 1939 hod. Chto pryšle padpisku **da 1.III.1939 adrazu za ŭvieś hod,—atrymaje**

premiju—knižki

Якуб Колас — Сымон Музыка (паэма) 1,00
Hadleŭski W. ks.—Śviataja Historyja Nowaha Zakonu 1,50
„ „ „ Śviataja Historyja Stzroha Zakonu 1,00
Adwažny W. - Biełaruskija cymbały (zbornik vieršaŭ) 0,50
Арсеньнева Н.—Пад сінім небам (зборнік вершаў) 1,20
Паўловіч С. — Першыя зерняткі. Беларуская граматка для хатняга навучаньня . . 0,50

Chto pryšle da taho-ž 1.III.1939 adrazu **za paŭhoda, atrymaje jak premiju nastupnyja knižki:**

Adwažny W. — Chłapiec (povieść) 1,50
Гарэцкі М. Хрэстаматыя бел. літаратуры XI в.—1905 2 00

Hrošy najvyhadniej prysyłać „przekazem rozrachunkowym“. Numar našaha konta: 63.

Vydaviectva „Chryścijanskaj Dumki“.

Ужо выйшаў з друку і прадаецца

Беларускі Сялянскі Календар кніжка на 1939 г.

128 бачынаў, багаты і цікавы гаспадарскі і асьветны зьмест.
Цана 1 экз. календара 50 гр., хто купляе больш дастае вялікі спуск.
Усюды дамагайцеся „Беларускага Сялянскага Календара на 1939 г.“
Галоўны склад: Бел. Кнігарня «ПАГОНЯ»: Wilno, Завальная 1.

Закон аб Праваслаўнай Царкве ў Польшчы

Дасюль Праваслаўная Царква ў Польшчы мела праўны характар у дзяржаве тымчасовы, бо была апёрта на г. зв. тымчасовых распараджэньнях дзяржаўнай улады.

19 XI.1938 г. абвешчаны дэкрэт Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай, які дае сталую законную падставу Царкве ў Польшчы і нармуе адносіны дзяржавы да яе.

Гэты закон, уняты 86 артыкуламі ў 28 разьдзелах,пастанаўляе:

1) Праваслаўная Царква ў Польшчы кананічна нераздзельная з іншымі Праваслаўнымі Цэрквамі і зьяўляецца аўтокефальнай у Рэчыпаспалітай.

2) Выбары мітрапаліта адбываюцца паводле царкоўных канонаў, саборна-дэмакратычным спосабам. Выбраны мітрапаліт мае так-жа выбранага заступніка і зьяўляецца адначасна архімандрытам Пачаеўскай Лаўры.

3) Закон прызнае *Генэральны Сабор* Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, а так жа сабор епіскапаў.

4) Сьв. Сынод зьяўляецца ня толькі выканаўчым органам епіскапскага сабору, але так-жа напалавіну складаецца з выбраных сяброў.

5) Устанаўляецца *Галоўная Кантрольная Камісія* дзеля рэвізіі фінансаў і гаспадараваньня цэлай Царквы. Камісія гэта выбіраецца дэмакратычным спосабам.

AD. STANKIEVIČ

Biełaruski Chryścijanski Ruch

Histaryčny narys.

RAZDZIEŁ XI. 31)

Apošnija padziei BChD.
(1930—1935).

§ 1. — Niezdavoleńnie starym i šukańnie abnovy

Apošni peryjad pracy isnavańnia BChD dalej adznačajecca ŭ niekatoraj miery niezdavoleńniem i šukańniem niečaha novaha. Sprava ŭ tym, što ŭ biełaruskim hramadzkim žyćci zaznačyŭsia vyrazny pierarost palityki koštam kultury, ci viarniej — u hetym biełaruskim žyćci vyrazna zaznačyłasia palitykanstva zamiest tvorčaj ideolohičnaj palityki i zamiest pracy na biełaruskaj narodnaj kulturnaj nivie. Takim čynam kidałasia jaŭna ŭ vočy patreba pierahladu ŭ biełaruskim hramadzianstvie adnosinaŭ da prablemy biełaruskaj palityki i kultury, patreby ich ažyŭleńnia, adnaŭleńnia i ŭzajemnaha koordynavańnia.

U kruhoch BChD šmat ab hetym razvažałasia, havaryłasia i ŭrešcie pajavilisia ab hetym bolš-mienš skonkretyzavanyja dumki ŭ „Бел. Крыніцы“, u art. „І Культура й палітыка“.[1])

Ad hetaha bolš-mienš času BChD pačała ŭ mieru svaich mahčymaściaŭ bolš ažyŭlenuju pracu kulturnuju, pradusim na nivie vydavieckaj i pačała tak-ža zastanaŭlacca nad prablemaj bolšaha zaktyvizavańnia i pahłybleńnia biełaruskaj palityki.

U tym-ža 1931 h. 13.XII adbyŭsia jašče źjezd delehataŭ BChD. „Papiaredni hetki źjezd — piša „Бел. Крыніца“ — adbyŭsia ŭ 1928 h. u listapadzie miesiacy. Ad hetaha času prajšło, jak bačym, try hady i źjezdy padobnyja nie adbyvalisia. Hetamu na pieraškodzie stajali roznyja pryčyny, pradusim — niezaležnyja ad samoj arhanizacyi.

Urešcie ŭsie pieraškody pakanany i čarodny źjezd adbyŭsia ŭ Vilni 13.XII s. h., u liku bolš sotni asob. Sialanie, pradstaŭniki našaj arhanizacyi, nia hledziačy na niazvyčajna ciažkoje ich sučasnaje haspadarčaje pałažeńnie, uziajšy siaho-taho ŭ torbačku, časta pazyčyŭšy ŭ susieda krychu załatovak

1) „І Культура й Палітыка“ — „Бел. Крыніца“ № 6, 13.II.1931.

6) Закон устанаўляе *Епархіяльную Управу*, сарганізаваную на прынцыпе саборнасьці.

7) Епархіяльны епіскап кіруе епархіяй пры помачы *кансысторыі, епархіяльных сабраньняў і рэвізыйнай камісіі*. Правы епархіяльнага сабраньня вельмі вялікія: яно выбірае епіскапа, сябраў галоўнай кантрольнай і рэвізыйнай камісіі. У склад кансысторыі ўваходзіць адна сьвецкая асоба. Сяброў кансысторыі выбіраюць на 5 гадоў. Зацьвярджае іх епіскап у паразуменьні з ваяводам. Сакратара кансысторыі назначае епіскап.

8) Духоўны суд апёрты на кананічных падставах. Судзьдзямі могуць быць толькі духоўнікі.

9) Благачынных выбірае духавенства благачыннага вокругу на 5 гадоў. У парахвіях устанаўляюцца асобныя сабраньні і парахвіяльныя рады. Яны маюць шырокія правы, але сьвяшчэньнікі маюць рашаючы голас і будуць назначаны епіскапам.

10) Усе прэсавыя органы мітраполіі і епархіяльныя афіцыяльныя часапісы будуць выходзіць выключна ў дзяржаўнай мове.

Гэтак прадстаўляецца праўнае палажэньне Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Правы шырокія. Карысьць з іх для праваслаўнага насельніцтва Рэчыпаспалітай залежа ад сумленнага выкананьня сваіх абавязкаў духоўнай уладай і выкананьня гэтага закону ўладамі дзяржаўнымі.

Сідарчук.

Najvažniejšaja sprava našaha narodu.

Treba viedać i nikoli nia možna zabyvacca, što fundamantam kožnaha narodu, na jakim apirajecca jaho isnavańnie, jość jahonaje ŭłasnaje haspadarčaje žyćcio. Biełaruski narod — heta narod pieravažna sialanski. Najvažniejšaj spravaj u Biełarusaŭ jość i budzie ziamla. Małaziamielle, biezziamielle, dalejšaje drableńnie i tak užo razdroblenych sialanskich haspadarak, a tak-ža nieabchodnaść zbolšańnia ziemlarobskaj pradukcyi, kab prakarmić prynamsi pryrost nasielnictva — voś zadača, što vystupaje na pieršy plan miž inšymi spravami i rašuča damahajecca razrašeńnia.

Adzinym sposabam uparadkavańnia i ŭnormavańnia hetaj vielmi važnaj spravy jość: chutaryzacyja z pryrezkaj ziamli małaziamielnym haspadarkam, nadzieł ziamloj biezziamielnych sialan, niepadzielnaść haspadarak i meljoracyja; paśla hetaha — padniaćcie na vyšejšuju stupień haspadarčaj kultury: palepšańnie zboža, hadoŭli skaciny i arhanizacyja zbytu ziemlarobskaj pradukcyi. Pobač z hetym nieabchodnym jość fachovaje školnictva, jakoje pryhataŭlała-b lišnija sialanskija siły da pracy ŭ inšaj halinie haspadarčaha žyćcia.

Našaje sialanstva vielmi pastupovaje i pracavitaje. Ale ŭ takim pałažeńni, u jakim haspadarča ciapier znachodzicca, prajavić svajej haspadarčaj pastupovaści i karysnaj pracavitaści prosta nia maje mahčymaści. Biez praviadzieńnia kamasacyi z pryrezkaj ziamli małaziamielnym haspadarkam nia moža być i hutarki ab zbolšańni ziemlarobskaj pradukcyi. Heta daŭno zrazumieli ŭsie kulturnyja narody, da hetaha imknucca znaŭcy ziamielnaj haspadarki i ŭ Polščy.

U karotkim hazetnym artykule trudna dakładna abhavaryć vielmi šyrokuju spravu kamasacyi i ahułam ziamielnaha ŭparadkavańnia. Ale nabližajecca zima z doŭhimi viečarami. Sialanie ŭ hetyja viečary źbirajucca na hutarki. U susiedzkich hutarkach treba abhavarvać parušanyja vyšej spravy. A kab šyrej padzialicca pahladami — na hetyja temy treba pisać u hazetu artykuły i karespandencyi.

Hetaja sprava — sprava ziamli, sposab i forma jaje karystańnia, nie zvažajučy na biahučyja palityčnyja padziei, jość vielmi važnaj i musić być naležna vyrašana. Dyk treba joj bližej, pasobku i ahułam, bolš cikavicca, analizavać padavanyja prajekty inšymi i padavać svaje. Jak u kožnaj, taksama i ŭ hetaj spravie teoretyčna lepš samym sabie prajektavać, čymsia tolki słuchać prajektaŭ prysłanych ad niekul.

p.

---

na bilet, z dakładnym razumieńniem važnaści rodnaj spravy, achvotna prybyli na źjezd.

Delehaty BChD—heta nia byli zvyčajnyja źjazdovičy. Nie. Heta byli śviedamyja Biełarusy, a tak-ža śviedamyja siabry svajej arhanizacyi. Ab hetym vymoŭna śviedča, jak achviarnaje ich prybyćcio na źjezd, taksama i ŭčaście ich u źjeździe. Sprava ŭ tym, što delehaty pryniali niespadziavana dziejnaje ŭčaście ŭ pracach źjezdu.

Delehaty dakładna tak-ža admalavali abraz žyćcia siańniašniaj biełaruskaj vioski. Abraz hety sapraŭdy žudasny.

Nia hledziačy adnak na hetuju žudaść žyćcia našaj vioski, vioska heta ŭściaž pahłyblaje svaju biełaruskuju nacyjanalnuju śviedamaść, uśviedamlajecca palityčna i nia tracić nadziei na lepšaje zaŭtra. Asabliva cikavy ŭ našym siale toj fakt, što siało heta ŭžo daskanalna raźbirajecca ŭ labiryncie biełaruskich palityčnych hrup i hrupak. Vioska naša siańnia ŭžo daskanalna znaje, jak svaich pryjacielaŭ i abaroncaŭ, tak i svaich zdradnikaŭ, jakich apošnim časam namnožyłasia davoli jak u Vilni, tak i na siale. U vyniku ŭsiaho hetaha, jak śćvierdziŭ źjezd, davier da BChD, jak sapraŭdy vyprabavanaj, stojkaj i viernaj baraćbitki za vyzvaleńnie Biełaruskaha narodu, u narodzie hetym raście i štoraz hłybiejšyja zapuščaje kareńni.

Urešcie cety rad pryniatych źjezdam rezalucyjaŭ, papraŭki ŭ prahramie i statucie, a tak-ža vybary novych uładaŭ arhanizacyi, zakončyli sapraŭdy pracoŭny dzień źjezdu delehataŭ BChD.

I tak, adnaviŭšysia i duchova i arhanizacyjna, da dalejšaj pracy pad ściaham BChD na biełaruskaj nivie!"[1])

Na hetym źjeździe byŭ pryniaty cely rad rezalucyjaŭ, jakija śćviardžajuć ciažkoje pałažeńnie Biełaruskaha narodu ŭva ŭsich halinach jaho žyćcia. Źmiest hetych rezalucyjaŭ, za małymi vyniatkami, ahułam taki samy, jak i rezalucyjaŭ, pryniatych na źjezdach papiarednich. Hetyja rezalucyi źjaŭlajucca klasyčnym paćvierdžańniem staroha. Novaha hety źjezd u palityku BChD badaj nia ŭnios ničoha. Adnak henyja šyroka apracavanyja rezalucyi ab ciažkim pałažeńni Biełaruskaha narodu sami saboj zmušali dumać nia tolki siabraŭ BChD, ale tak-ža i ahułam biełaruskaje hramadzianstva ab ažyŭleńni pracy, ab novych darohach, ab abnovie.

1) Зьезд дэлегатаў БХД — „Бел. Крыніца" № 41, 1931.

Zdabyčy Karpackaj Ukrainy za 19 hadoŭ.

Karpackaja Ukraina ŭ pradvajennaj Vuhryi była zapuščanaj krainaj, jak u halinie kulturnaj i haspadarčaj, taksama i ŭ socyjalnaj. U 1918 h. u hetaj krainie nia było nijakich narodnych. haradzkich i siarednich škołaŭ u rodnaj movie miascovaha nasielnictva; tolki ŭ 34 carkoŭnych škołach možna było navučać niekatoryja pradmiety ŭ rodnaj movie vučniaŭ. Usio školnictva było ŭ vuhorskim duchu i służyła vuhorskaj nacyjanalnaj palitycy.

U praciahu 19 hadoŭ narod u Karpackaj Ukrainie zdabyŭ 457 ukrainskich narodnych škołaŭ, 22 škoły haradzkija i 7 siarednich, pobač z hetymi 8 fachovych a 105 dapaŭniajučych škołaŭ. Aprača hetaha Karpackaja Ukraina maje značny lik studentaŭ, jakija vučacca ŭ Prazie, Bernie i Bratysłavie.

Niahramatnaść, 20 hadoŭ tamu za časoŭ panavańnia Vuhryi, u niekatorych pavietach dasiahła bolš 70 prac. Ciapier, dziakujučy razbudovie školnictva i natužnaj pracy ŭ halinie zaškolnaj aśviety, niahramatnaść upała zusim. Karpackaja Ukraina ŭžo maje pavažny lik maładoj intelihencyi, jakaja pavoli pierajmaje duchovaje, kulturnaje i palityčnaje kiraŭnictva ŭłasnaha narodu i sobskaj krainy.

Niamała zroblena za hetyja 19 hadoŭ i ŭ halinie haspadarčaj, asabliva ŭ sielskaj haspadarcy i razbudovie daroh dy hramadzkich budynkaŭ.

Ab haspadarstvach u siaredniaj Eŭropie

Hranicy siarednia-eŭropejskich haspadarstvaŭ (dziaržavaŭ) uściaž źmianiajucca. Za sioletni hod traščeli i łamalisia jany až try razy.

Z usiaho hetaha najbolš skarystała *Niamieččyna*, katoraja niespadziavana razrasłasia. Niamieckaje haspadarstva zajmaje ciapier abšar 583.000 kv. klm., usich-ža žycharoŭ maje 78,7 milijonaŭ i źjaŭlajecca takim čynam najbolšym haspadarstvam Eŭropy paśla SSSR.

Polšč atrymała ad Čechasłavaččyny čatyry paviety, abšar jakich zajmaje 805 kv. klm. Žyvie tam, pavodle českaje statystyki i danych u abmiennych notach českaha i polskaha ŭradaŭ, apublikavanych u polskaj presie, 230.000 asob.

Madziarščyna atrymała z abšaru dasiulešniaje Čechasłavackaje respubliki 12,400 kv. klm. z 1064000 žycharoŭ. Adyjšło da jaje najbolš ziemlaŭ etnahrafična ukrainskich z najvialikšymi miestami Karpackaje Ukrainy: Užhorad, Mukačeŭ i badaj z usimi čyhunačnymi šlachami.

Čechija ahułam maje ciapier usiaho nasielnictva kala 7 milijonaŭ asob. Abšar jaje zajmaje kala 50 tysiač kv. klm. Nia hledziačy na vialikija straty, Čechi majuć jašče šmat naturalnych bahaćciaŭ, jak kapalni vuhla, žaleznaje rudy, šmat roznych fabrykaŭ, vialikija fabryki aružža, amunicyi i mašynaŭ.

Słavakija, paśla kanferencyi ŭ Vienie i paśla adychodu častki jaje ziamiel da Madziarščyny, zajmaje abšar 38,601 kv. klm. Nasielnictva maje 2,416,856 asob, z hetaha — 2,002,143 słavakaŭ, 66,368 madziaraŭ, 138,564 niemcaŭ, 89,093 ukraincaŭ, 39,360 žydoŭ i inš.

Karpackaja Ukraina zajmaje ciapier 11,028 kv. klm. Ahulny lik nasielnictva 543,748, z čaho — 430,181 ukraincaŭ, 22,791 madziaraŭ, 53,832 žydoŭ, 8,341 niemcaŭ, 12,000 rumynaŭ, 16,714 słavakaŭ i čechaŭ. Pałažeńnie Karpackaje Ukrainy davoli ciažkaje, asabliva dziela taho, što madziary padsyłajuć tudy svaich ahitataraŭ, katoryja starajucca vyklikać roznyja zabureńni škiravanyja suproć ukraincaŭ. Z druhoj starany ŭ Polščy znajšłasia ŭžo hrupa publicystaŭ, jakija ŭ presie i na sabrańniach zaklikajuć da likvidacyi Karpackaj Ukrainy. Kidajuć navat klič, kab polskaje vojska pajšło na Karpackuju Ukrainu i pamahło zaniać jaje Madziaram. Ale hranicy Karpackaje rainy hvarantujuć Niamieččyna i Italija. Viedajem-ža, što Niemcy ciapier nihdzie nia ŭstupajuć, nia ŭstupiać chiba i tut, tymbolš, što plany ich na ŭschodzie vielmi vialikija. **Čik.**

Ciapier, kali Karpackaja Ukraina stałasia samastojnaj, razvoj svoj paviadzie jašče šybčej.

N.

I sapraŭdy. U 1934 h. ŭ № 35 „Бел. Крыніцы“ pajaviŭsia artykuł: „Час абнавіцца“.

Byŭ heta zaklik BChD da siabroŭ svaich i ahułam da hramadzianstva vykazacca ab patrebie abnaŭleńnia BChD i ab tym, u jakim kirunku hena abnova maje pajści. Ad hetaha času pravodziłasia dyskusija nad abnovaj prahramy BChD: praz kaniec 1934 h. i praz uvieś 1935 hod. Za hety čas u „Bieł. Kr.“ było nadrukavana nieśta bolš 15 artykułaŭ, u jakich razvažalisia roznyja prahramnyja ideolohična-biełaruskija prablemy. U vyniku hetaj dyskusii była apracavana novaja prahrama i BChD abnoŭlena na BNA. Akančalna i farmalna stałasia heta ŭ studni miesiacy 1936 h.

§ 2. — Abnova, jaje pryčyny i sutnaść.

Henaje ciažkoje pałažeńnie Biełaruskaha narodu, ab jakim uspomniena vyšej, a tak-ža zastoj i časta adstałaść pracy na biełaruskaj narodnaj nivie, źjaŭlajecca pryčynaj, što zmušała BChD da svajho abnaŭleńnia. Jość heta ahulnaja, vynikajučaja z biełaruskaha žyćcia, pryčyna. Ale aprača hetaj ahulnaj jość jašče cely rad pryčyn bližejšych, kankretniejšych.

BChD na ŭsim śviecie, dzie jana isnavała ci isnuje, usiudy i zaŭsiody jość jana arhanizacyjaj sacyjalna-chryścijanskaj, z natury svajej apalityčnaj. I kali hdzie jakaja palityčnaja arhanizacyja nazyvajecca chryścijanskaj, ci katalickaj, dyk heta zvyčajnaje nieparazumieńnie, abo tolki prypadak. BChD ŭ svaim mienskim peryjadzie była apalityčnaj. U Vilni BChD pryniała charaktar palityčny, ale heta faktyčna nia było zhodna ani z istotaj chryścijanstva, ani z navukaj i praktykaj Katalickaha Kaścioła, ci Pravasłaŭnaj Carkvy, jakija tak-ža ŭ sutnaści źjaŭlajucca apalityčnymi. Duža jasna i hłyboka tłumača heta J. E. mitrapalit Andrej Šeptycki. Voś jaho ab hetym słovy:

„Užo ŭ samym paniaćci katalicyzmu, ci ŭniversalizmu mieścicca zapiarečańnie taho, što možna nazvać partyjaj. Katalicyzm heta ohuł, heta celaść, a partyja heta tolki niejkaja častka. Tamu ŭsie kataliki śvietu pryniali tezu, što **nia moža być palityčnaj katalickaj partyi** i što katalicyzm i palityka — heta dva słovy, jakija, razam złučanyja, mieściać u sabie „contradictionem in terminis“ — supiarečnaść samuju ŭ sabie.

Niamieckaje „Centrum“, abo italjanskuju „Par-

Prezydent Litvy A. Smetona

14 listapada 1938 h., jak my ŭžo pisali, u Kaŭnasie adbylisia vybary prezydenta Litvy. Vybrany Antanas Smetona, jaki vysoki prezydencki litoŭski pasad zajmaje ŭžo ad 1926 hodu.

A. Smetona jość synam sielanina, radziŭsia 10.V.1874 h. u Užulenach. Z małych dzion vyjaŭlaŭ jon vialikija zdolnaści i budučy jašče vučniam pačaŭ pracu na litoŭskaj adradženskaj nivie. Pry tym za admovu malicca parasiejsku byŭ jon vykinuty razam sa svaimi 132 kalehami litoŭcami z himnazii. Paśla adnak dabiŭsia jon asabista ŭ Pieciarburzie da ministra aśviety i dastaŭ dazvoł končyć adnu z pieciarburskich himnazijaŭ. Končyŭšy himnaziju, studyjavaŭ prava ŭ universytecie ŭ Pieciarburzie. Pierajechaŭšy paźniej u Vilniu, pracavaŭ u pryvatnym banku, raźvivajučy enerhična kulturnuju, publicystyčnuju, nacyjanalnuju litoŭskuju pracu. Jon vydavaŭ i pisaŭ knižki, artykuły, karespandavaŭ, rabiŭ pierakłady, pracavaŭ u lit. arhanizacyjach, paśviačajučy siabie svajmu narodu. Ahułam napisaŭ jon 1617 tvoraŭ. Revizii, aryšty, ssyłki nia strymlivali i nia źbivali jaho z vybranaha šlachu. Urešcie A. Smetona 16.II.1918 h. pieražyŭ vialikuju histaryčnuju chvilinu, budučy staršynioj kanferencyi 264 litoŭcaŭ, jakaja abvieściła Litvu Niezaležnym Haspadarstvam. Poŭny viery, enerhii, čerpajučy siły z narodnaje sialanskaje stychii, A. Smetona pracavaŭ dla dabra svajho kraju, a zaniaŭšy prezydencki pasad, umacoŭvaŭ jahonuju dziaržaŭnaść, zavodziačy ład i dabrabyt, jaki padziŭlajuć haspadarstvy daloka bolšyja ad Litvy i bahaciejšyja naturalnymi bahaćciami.

Stojkaść, viernaść, ideovaść i biazupynnaja praca Prezydenta A. Smetony dla dabra svajho narodu, moža być prykładam kožnamu čałavieku ŭ adnosinach da intaresaŭ svajho kraju.

J. N.

Biełaruskaja chronika.

Biełarusy i vybary ŭ samaŭrady. U suviazi z vybarami ŭ terytoryjalny samaŭrad u našym Kraju, 20.XI.38 adbyłosia pasiedžańnie Prezydyjmu C. K. Bieł. Narodnaha Abjednańnia, na jakim pastanoŭlena vydać u spravie vybaraŭ u samaŭrad adpaviedny Kamunikat BNA № 9, jaki užo vyjšaŭ z druku i raspaŭsiudžvajecca. Vydaviectva-ž „Chr. Dumka“ vydała brašuru p. n. „Выбарная ардынацыя ў самаўрад“, apracavanuju red. J. Paźniakom. U brašury hetaj źmieščana tak-ža pradmova red. J. Najdziuka ab značeńni samaŭradu dla biełarusaŭ. Karysnuju hetuju brašurku dałučajem da hetaha numaru „Chryśc. Dumki,“ jak biaspłatny dadatak dla našych čytačoŭ.

Žurnalist z Halandyi 24.XI sioleta adviedaŭ našu redakcyju i inšyja biełaruskija ŭstanovy; cikaviŭsia žyćciom i adradženskim rucham Biełaruskaha Narodu.

Śviatkavańnie chrostu Biełarusi ŭ Vil. Bieł. Himnazii. 10.XI. siol. hodu ŭ dzień śv. Afrasinii — Apostałki Biełarusi — Vilenskaja Biełaruskaja Himnazija śviatkavała 950-hodździe chrostu Biełarusi.

Z žyćcia i dziejnaści biełaruskich studentaŭ. — 19.XI.38 u Biełaruskim Studenckim Sajuzie ŭ Vilni adbyŭsia cikavy dyskusyjny viečar na temu: „Biełaruski studencki časapis.“ Ustupnaje słova havaryŭ stud. J. Jaroška. —20.XI.38 adbyŭsia inaŭhuracyjny viečar u Tavarystvie Pryjacielaŭ Biełarusaviedy pry Vilenskim Universytecie. — 26.XI u B.S.S čytaŭ referat ab litaraturnaj krytycy M. Tank.

Z dziejnaści Biełaruskaha Kulturnaha Tavarystva ŭ Litvie. Biełaruski Narodny Teatr sarhanizavany Bieł. Kulturnym T-vam u Litvie sioleta letam i vosieńniu abjechaŭ cely rad miascovaściaŭ u Litvie, dzie žyvuć biełarusy, niasučy im sa sceny žyvoje biełaruskaje słova.

Usiakuju biełaruskuju knižku, KALENDARY, hazetu najtaniej i najchutčej dastaniecie ŭ biełaruskaj

Kniharni „Pahonia“

Wilno, Zavalnaja vulica № 1.

Kataloh biełaruskich knižak, na žadańnie, vysyłajecca darma.

tito popolare“[1]) uvažajuć palityčnaj katalickaj partyjaj tolki tyja ludzi, jakija aceńvajuć ich nadta paviarchoŭna, hladziać na ich nadta zdaloku.

Niamieckaje „Centrum“—heta palityčnaja partyja z točna aznačanaj palityčnaj prahramaj. Praŭda, jana pieravažna składajecca z katalikoŭ, ale jość tam tak-ža i pratestanty, a navat i Žydy. Z druhoha-ž uznoŭ boku jość Niemcy kataliki, jakija nie zhadžajucca z prahramaj „Centru“ i naležać da inšych parlamantarnych hrupaŭ. Niamieckaje „Centrum“ zaścierahajecca navat procíŭ nazovy katalickaj partyi, uvažajučy siabie partyjaj naskroź palityčnaj. A toje, što ŭ hetaj partyi sabrałasia bolšaja kolkaść katalikoŭ, zrabiŭ prypadak: — baraćba Bismarka z Katalickim Kaściołam. U vyniku hetaj baraćby mnoha katalikoŭ zhurtavałasia ŭ hetaj partyi, jakaja, pobač čysta palityčnaj prahramy, pryniała jašče prahramu abarony viery i Katalickaha Kaścioła procíŭ praśledavańnia jaho Bismarkam.

Padobnaja-ž sytuacyja paŭtaryłasia tak-ža i ŭ Italii. Pierad zaniaćciem Rymu fašystami, narodnaja partyja, abo tak zvanaja „Partito popolare“ miela svaju ŭłasnuju sacyjalnuju i palityčnuju prahramu. Poruč z hetaj prahramaj jana pastaviła sabie zadańnie dziela abarony Kaścioła barocca tak-ža z sacyjalizmam, masonstvam i kamunizmam. Hetkim čynam u vačach ohułu z partyi čysta palityčnaj stałasia jana partyjaj katalickaj.

Hetyja dva prykłady z žyćcia katalickich hramadzianstvaŭ skrapili ŭ katalickich sacyjalohaŭ tezu, ciapier ahulna pryniatuju, što katalickaja partyja z jakoj-niebudź točna aznačanaj palityčnaj prahramaj: jość supiarečnaść sama ŭ sabie. I spravadliva: kožnamu kataliku volna naležyć da jakoj-niebudź partyjna-palityčnaj hrupy, jakoj prahrama nia jość supiarečnaj katalickaj viery i etycy. Voś-ža katalik moža być manarchistam, kanservatystam, demakratam, pryncypijalistam ci ŭhadoŭcam, a navat, u niekatorych vyniatkavych abstavinach, ekstremistam.[1])

Navat takija pryncypy Katalickaha Kaścioła, jak pasłuchmianaść zakonam i śvieckaj ci duchoŭnaj uładzie, jość teoretyčna akružany takimi ŭmovami i zaściarohami, što ŭ praktycy možna znajści ŭ mnohich dziaržavach ci mała zakonaŭ, jakija nia

1) „Centrum“ źlikvidavaŭ Hitler, a „Partito popolare“ źlikvidavaŭ Mussolini.

1) krajnim, radykałam.

Viečar litoŭskaj litaratury.

U niadzielu 27 listapada siol. ŭ hałoŭnym budynku Vilenskaha Universytetu Biełaruski Studencki Sajuz sarhanizavaŭ viečar litoŭskaj litaratury. Paśla pryvitańnia staršyni Sajuzu Adama Dasiukieviča prysutnych, jakimi zapoŭniłasia zala VI universytetu, vilenskaja litoŭskaja litaratka Ona Miciute pračytała doŭhi referat, pradstaŭlajučy ŭ im šyroka historyju i sučasny stan litoŭskaj litaratury. Prelehientka mnohimi histaryčnymi faktami, cełaj haleryjaj vydatnych pradstaŭnikoŭ litoŭskaha mastackaha słova, mnostvam vydanych i napisanych imi tvoraŭ, pierakanała słuchačoŭ ab bahactvie i vartaściach duchovych bratniaha nam litoŭskaha narodu, jaho tvorčych zdolnaściach, bahactvie rozumu, voli i serca. Za svoj račovy, pryhoža apracavany referat prelehientka zasłužana atrymała ad arhanizataraŭ padziaku, a ad prysutnych buru vopleskaŭ.

Pa referacie, paśla karotkaha pieraryvu, adbylisia deklamacyi vieršaŭ litoŭskich paetaŭ u pierakładzie na biełaruskuju movu — Ony Miciute, prelehentki, Albina Žukaŭskasa, Jozasa Kekštasa, Jonasa Kossu-Aleksandravičiusa. Pryhoža deklamavali hetyja vieršy: Maksim Tank, Hanna Suchaja, V. Čarneckaja i M. Smarščok.

Viečar zrabiŭ vielmi sympatyčnaje ŭražańnie i daŭ prysutnym mnoha karyści ŭ spravie paznańnia litaraturna-kulturnaha ruchu našych bratoŭ Litoŭcaŭ. Kab-ža čaściej takija viečary adbyvalisia!

LISTY

Usim čytaŭ hołasna „Chryśc. Dumku“.

Plusy, Brasłaŭski pav. Idučy piechatoj u Plusy z Kryvasielcaŭ, nohi nie zabalać, bo tolki 7 klm. Pieršaj vioskaj majej padarožy była Prachoraŭka, niedaločka vo ziera Snudy. Heta pieknaje voziera z mnohimi vyspačkami, akružana mnohimi vioskami, lesam i viežu słabodzkaha kaścioła biełuju vidać u dali. Idu dalej i słuchaju, jak pastušok piaje pieśni biełaruskija staryja, pasučy karoŭ z aviečkami. U Plusie zajšoŭ na poštu, dzie atrymaŭ šmat hazet, a miž inšym i „Chryśc. Dumku“. Ludzi kuplali ad hazetnikaŭ hazety, a ja čytaŭ z vialikim zacikaŭleńniem svaju „Chryśc. Dumku“. Pa niešpary pajšoŭ damoŭ u svaje Kryvasielcy. Tut najšło susiedziaŭ sialan i inšych, i ja ŭsim čytaŭ „Chryśc. Dumku“ hołasna. *Vajciech.*

Бяды благім чынам не паправіш.

Чэрэса, Браслаўскага павету. Цяжкое жыцьцё і недахоп зямлі адбіваецца на сялянах вельмі сумна. Жывучы на малых гаспадарках і зносячы ўсякія нягоды, людзі часта наракаюць на сваю долю, а на'т і на бацькоў, што яны пусьцілі іх на сьвет. Дык вось дзеля гэтага цяперашнія многія маладыя людзі часта сваіх дзяцей проста ня пускаюць на сьвет, да чаго ня рэдка прыкладаюць сваю руку бабкі — парадкі, якіх нямала ёсьць на нашых вёсках і яны ня рэдка губяць жыцьцё маладым кабетам, каторыя зварочваюцца да іхняй помачы. Вось-жа трэба ведаць, што благім чынам долі не паправіш. *Сусед.*

Sprava Žydoŭskaha narodu.

Žorstkaje praśledavańnie Žydoŭ u Niamieččynie vyklikała vialikaje abureńnie ŭ cełym kulturnym śviecie. Najbolš uzvarušyła hramadzkuju apiniju nialudzkaje pastupańnie niamieckaha ŭradu adnosna Žydoŭ u Anhlii, Amerycy i Francyi. Prezydent Zł. Št. Paŭnoč. Ameryki Ruzvelt na znak pratestu adklikaŭ z Niamieččyny svajho pasła. Usia presa demakratyčnych krajoŭ pastupak niamieckich hitleraŭcaŭ adnosna Žydoŭ asudžaje, jak zvyčajny arhanizavany bandytyzm. Prezydent Ruzvelt zajaviŭ aficyjalna, što žorstkaje praśledavańnie Žydoŭ u Niamieččynie vyklikaje ahidu.

Trahičnaje pałažeńnie Žydoŭ u Niamieččynie zmusiła kulturny śviet šukać dla ich miesca na śviecie. Ameryka i Anhlija pačynajuć stavić spravu Žydoŭskaha narodu, jak zadaču mižnarodnaha značeńnia. Ciapier ab spravie Žydoŭskaha narodu havorać i pišuć na ŭsim śviecie. Adny radziać — dać miesca Žydoŭskamu narodu ŭ Afrycy, druhija — ŭ Amerycy, a inšyja — ŭ b. niamieckich afrykanskich kalonijach. Ale da hetaha patrebny vialiki kapitał — i na pierasialeńnie i na novaje zahaspadaravańnie.

---

susim abaviazvajuć katalikoŭ i jość niamała vypadkaŭ, u jakich jany henych zakonaŭ nie kaniečnie abaviazany słuchać. Naprociŭ, nia vyklučajucca vypadki, u katorych kataliki mohuć henym zakonam i henym uładam pracivicca. Znača, navat toje, što nazyvajem lehalnaściaj, nia ŭsio naleža da tych pryncypaŭ, jakija biazumoŭna i ŭsiudy abaviazvajuć katalikoŭ.[2])

Toje-ž samaje, što J.E. Mitrapalit A. Šeptycki skazaŭ ab Katalictvie, treba skazać i ab Pravasłaŭi. Palityčnaja partyja, što siabie zavie chryścijanskaj, — katalickaj ci pravasłaŭnaj, faktyčna takoj nia moža być. Chryścijanskaść takim čynam u BChD, jak u palityčnaj partyi, jość niečym štučnym i nieadpaviednym.

Pryčynaj abnovy BChD było tak-ža i toje, što hetkaha nazovu i charaktaru arhanizacyja, choć-by navat i ahraničałasia tolki da spraŭ sacyjalnych apalityčnych, u Eŭropie siańnia jość užo pieražytkam. Siańnia tam užo zamiest „sacyjalnaha chryścijanizmu“ šyroka raźvivajecca „Katalickaja Akcyja“, jakaja maje na mecie ŭžo nia tolki spravy sacyjalnyja ŭ duchu katalickim, ale tak-ža i badaj prad usim katalickaje vychavańnie moładzi i ahułam apostalstva katalickaj spravy pry pomačy śvieckich ludziej.

BChD z chryścijanskaj aficyjalnaj nazovaj, davała prava ŭmiešvańnia ŭ jaje duchoŭnaj uładzie. Ułada-ž heta ŭ nas, jak u katalikoŭ, tak i ŭ pravasłaŭnych, čužaja Biełarusam nacyjanalna, pracy BChD spryjać nie mahła, a mahła być tolki zaminaj i pieraškodaj. Praktyka ŭrešcie pakazała, što hetak było sapraŭdy.

BChD mieła katalickija relihijnyja tradycyi. Zakładali jaje i paśla ŭ jej pracavali, niekatoryja z ich poŭniačy časta vydatnuju rol, ksiandzy Biełarusy. Da taho-ž i „Bieł. Krynica“, orhan BChD, asabliva ŭ pieršym dziesiatku svajho isnavańnia, davoli šmat udzialała miesca spravam relihijnym katalickim, a paźniej unijackim i pravasłaŭnym. Hety-ž fakt nadavaŭ BChD charaktar užo kali nia vyklučna katalicki, dyk prynamsi vyznaniovy, konfesyjny. A heta ŭsio razam zvužała idejnyja ramki BChD i ludziej, dumajučych palityčnymi katehoryjami i chočučych u šyrejšaj palitycy pracavać, ad BChD adpichała.

2) Андрей, Митрополит — „Український Католицький Союз і Политика“ (Мета“ № 14, 1932).

Выбарная ардынацыя ў самаўрады

Закон аб выбарах грамадзкіх, валасных і паветавых радных в 16. VIII.1938 г. (Dz. U. Nr. 63, raz. 481).

Выбары паветавых радных.

Выбары паветавых радных адбываюцца тайным галасаваньнем. Выбірае выбарная калегія, якая складаецца: а) з валасных радных, б) сябраў валасных урадаў, в) з радных і сябраў урадаў местаў, каторыя ня выдзеленыя з павету.

Лік паветавых радных прыпадае на кожную валасьць да 10.000 жыхароў — 2 пав. радных.

Выбары адбываюцца або ў аднэй валасьці, або паветавы староста на выбары можа злучыць некалькі валасьцяў. Аднак ня можа быць валасьць разьдзелена і прыдзелены яе часьці да другіх выб. калегіяў.

Паветавым радным можа быць кожны грамадзянін, які прабывае на тэрыторыі павету і мае ўсе правы вымаганыя законам быць валасным радным. Апрача гэтага мусіць умець гаварыць і пісаць папольску.

Паветавыя выбары абʼяўляе ваявода. Пасьля паветавыя старасты паведамляюць валасьці колькі, калі і дзе валасныя калегіі павінны выбраць паветавых радных. Войт за 7 дзён прад выбарамі паведамляе ўсіх законных выбаршчыкаў.

Выбарчая камісія складаецца з старшыні і 2 сябраў. Старшынёй камісіі—войт, а сябраў выбірае выбарная калегія.

Кандыдатуры.

Калі калегія мае выбіраць 2 паветавых радных, дык падаюцца кандыдатуры на павет. радных асабова — без сьпіскаў. Калі калегія выбірае 3 павет. радных, тады падаюцца сьпіскі. На паданьне кандыдатуры і сьпіску кандыдатаў на павет. радных абавязуе тое-ж правіла, што і на валасных радных. Падаць кандыдатуры на 2 х радных і сьпісак кандыдатаў могуць 6 тая часьць усіх сябраў выб. калегіі ў аднэй валасьці, а ў калегіі некалькіх валасьцяў 8 ая часьць усіх сябраў данай выб. калегіі.

На доказ уменьня гаварыць і пісаць папольску даволі прадставіць сьцьверджаньне, што кандыдат хадзіў 3 гады ў школу, дзе вучылі папольску, або напісаць прад старшынёй выб. калегіі некалькі слоў папольску; пры гэтым правапісныя абмылкі не бяруцца пад увагу.

Галасаваньне.

Галасаваньне адбываецца паводле арт. 27—35 гэтага выб закону, таксама, як у грамадзкіх выбарах. Зьмена ёсьць такая:

1) Выбіраючы 2 пав. радных выбаршчык галасуе толькі на аднаго кандыдата. На картачцы галасаваньня піша толькі аднаго кандыдата.

Выбраным ёсьць той, што дастане найбольш галасоў, але найменш 5-ю часьць галасоў важных.

2) Выбіраючы 3 пав. радных і больш абязуе правіла галасаваньня не сьпіскі, таксама, як у выбарах валасных радных.

Вынік галасаваньня ўстанаўляецца таксама, як у выбарах валасных радных.

Выбарны пратэст апіраецца на тых самых правілах, што і ў выбарах грамадзкіх.

Усялякія пісьмы ў справах выбараў грамадзкіх, валасных і паветавых аплаце штэмплёвай не падлягаюць.

Усе папярэднія законы аб грамадзкіх, валасных і паветавых выбарах трацяць абавязуючую сілу.

Канец.

Hetki charaktar BChD byŭ pieraškodaj u jej pracavać, jasnaja reč, i ŭsim tym ludziam, jakija adznačajucca abo vuzkim pahladam katalickim, ci takim-ža pravasłaŭnym, abo ŭrešcie i takim, jakija ŭ spravach relihijnych indyferentnyja, roŭnadušnyja, a to i susim niavierujučyja.

Ne misceantur profana sacris — niachaj nia miašajucca spravy švieckija sa śviatymi — kaža staraja pahavorka. Maje jana svoj sens i ŭ žyćci palityčnym ahułam, a hetym samym stasujecca i da BChD, jak palityčnaj arhanizacyi.

Ŭrešcie jašče adna pryčyna, jakaja zmusiła BChD da abnovy i da adpaviednaj reformy. Kali-b jana była konsekventnaj i zhodnaj z padobnymi arhanizacyjami ŭ Zach. Eŭropie, dzie jany raźvivalisia na padstavie papskich encyklik, dyk musiła-b vyračysia ŭsiakaj palityki, vyračysia tak-ža supolnaj pracy z pravasłaŭnymi i trymacca ramak tolki sacyjalnaha katalictva ci paśla Akcyi Katalickaj. Adnak BChD z hetaj darohi ŭściaž śviedama zychodziła, vypływajučy na šyrokija, ahulna biełaruskija, biaz roznicy vieravyznańnia, šlachi. Rabiła heta BChD — kažu — śviedama, zajmajučy ŭ biełaruskim palityčnym žyćci toje pustoje miesca, jakoje nie zajmaŭ nichto inšy, a jakoje zajmać treba było.

Za čдолжасаŭ isnavańnia BChD byli faktyčna ŭ biełaruskim žyćci tolki dva prahramovyja kirunki: BChD, jakaja adnolkava trymałasia jak ideałaŭ sacyjalnych, tak i nacyjanalnych i KPZB, jakaja, addajučysia, vyklučna ŭ svaim specyfičnym duchu, spravam sacyjalnym, spravy nacyjanalnyja nehavała susim, abo prynamsi ignoravała. Nacyjanalnaje biełaruskaje sumleńnie takim čynam dychtavała BChD vychodzić z vuzkich katalickich ci ahułam aficyjalna chryścijanskich ramak i vieści ahulna biełaruskuju nacyjanalna-sacyjalnuju palityku.

I BChD heta zrabiła akančalna, abnaŭlajučysia ŭ BNA.

Sutnaś-ža abnovy BChD jość jasnaj z usich henych tolki što pieraličanych pryčyn abnovy i z taho kirunku, u jakim jana pajšła. Viedama, hetaja sutnaść była-b jašče bolš vidavočnaj, kali-b paraŭniać prahramu BChD i z prahramaj BNA. Adnak hetaha tut rabić nia budziem, bo heta zanadta razšyrała-b, i tak niespadzieŭki razšyranyja ramki, hetaj pracy, dy i vychodziła-b za jaje miežy. Skažu tut tolki ahułam, — što sutnaść abnovy ŭ tym, što BNA — heta ŭžo švieckaja, ahulna-biełaruskaja, demakratyčna-palityčnaja arhanizacyja, pry tym zbudavanaja na asnovach, jakija ni ŭ čym nie piarečać tak-ža i spravam chryścijanskaj viery i maralnaści.

Przesyłka opłacona ryczałtem

Palityka

Z Polščy.

Pieršaja sesija Sojmu i Senatu. Pieršaja nadzvyčajnaja sesija novavybranaha Sojmu i Senatu dekretam Prezydenta sklikana 28 listapada siol. Hetaja sesija mieła charaktar narmalny—vybary maršałkaŭ i vice-maršałkaŭ Sojmu i Senatu, a tak-ža ŭstanaŭleńnie sojmavaha i senackaha rehulaminu.

Dekrety. Prad sklikańniem Sojmu i Senatu Prezydent vydaŭ niekalka dekretaŭ:

1) presavy zakon, jaki abymaje ŭsie hazety i ŭsialakija inšyja druki;

2) zakon ab acharonie dziaržavy;

3) zakon ab skaročańni terminu samaŭradaŭ i

4) zakon ab raźviazańni masonskiah arhanizacyjaŭ.

Samaŭradavyja vybary. Paśla zakančeńnia parlamanckich vybaraŭ va ŭsiej Polščy pačalisia samaŭradavyja vybary. Užo vyznačany vybary ŭ miestavuju Radu ŭ Varšavie, u inšych haradoch i pravodziacca vybary ŭ sielskahramadzkija rady.

Narady apazycyi. Paśla vybaraŭ u Sojm i Senat adbylisia narady Centralnych Kamitetaŭ P.P.S. i stron. Ludovaha. Na hetych narach abhavarvali polskija sacyjalisty i polskija ludoŭcy sučasnaje pałažeńnie Polščy mižnarodnaje i ŭnutranaje.

Z zahranicy

Hałoŭnaja padstava sučasnaj palityki. Suśvietnaja vajna 20 hadoŭ tamu zakončyłasia kličam Vialikaha Vilsona — „samaaznačeńnie narodaŭ." My bačym, što za hetyja 20 hadoŭ daśpieła ŭ śviecie niamała novych spraŭ i ŭsio bolš ich źbirejacca, vyklikajučy štoraz novyja palityčnyja padziei, jakija namahajecca sučasnaja palityka razrašyć konferencyjami i naradami, kab nie dapuścić da novaj suśvietnaj vajny.

Z hetaha vidać, što mir 1919 hodu, apiorty na militarnaj sile, nia zmoh uparadkavać mižnarodnych suadnosinaŭ i staŭsia niazdatnym instrumantam dziela ŭtrymańnia mižnarodnaha supakoju. Dla ŭtrymańnia miru i naładžańnia dobrasusiedzkaha mižnarodnaha sužyćcia sučasnaja palityka imkniecca da taho, kab zbudavać novy mižnarodny ład na pryncypie samaaznačeńnia narodaŭ.

Niamieckaja palityka ŭ anhielskim aśviatleńni. Anhielskaja hazeta „Tajms" ćvierdzić, što niamieckaja ekspansija nakiravana ŭ dva baki: na zamorskija kalonii i ŭ bok uschodniaj Eŭropy, dzie jana choča pašyryć svaje ekanamičnyja ŭpływy. U niamieckich palityčnych kruhoch — piša „Tajms" — panuje prakanańnie, što razvał SSSR znutra pačniecca nie ŭzabavie. Savieckaja Ukraina znajdzie łučnaść z pramysłovym centram Niamieččyny praz Karpackuju Ukrainu. Kali dapuścim, što pryjaznyja adnosiny Polščy da Niamieččyny ŭtrymajucca až da taho času, kali nadarycca nahoda vykarystać razvał SSSR dla supolnaj karyści, dyk heta nia budzie nijakaj fantazyjaj.

Jak daloka siahajuć plany Niamieččyny — źmieryć trudna. Ale realizacyja ich zaležna ŭ pieršuju čarhu ad padziejaŭ, jakija adbyvajucca pa-za kantrolaj Niamieččyny.

Z hetaha vidać, što ŭ Anhlii spadziajucca novaha ŭzrostu dalejšaj niamieckaj ekspansii na ŭschod.

Niamieckaje damahańnie kalonijaŭ i supiarečnaje stanovišča Francyi z Anhlijaj. Niamieckaja dyplomacyja, apošnimi časami, padniała damahańnie zvarotu Niamieččynie pradvajennych zamorskich kalonijaŭ. U adkaz na hetyja damahańni francuskija i anhielskija adkaznyja palityki vykazalisia rašuča praciŭ. — Francyja i Anhlija dabravolna addać dla Niamieččyny zamorskich kalonijaŭ nia chočuć.

Niamieččyna i Ukraina. Anhielski „Tajms" padaje, što ŭ niamieckich palityčnych kruhoch da spravy zamorskich kalonijaŭ pryviazvajuć druharadnaje značeńnie. Hałoŭnaja ŭvaha Niamieččyny skiravana na ŭschod. U niamieckich aficyjalnych kruhoch uvažajuć ciapierašniuju terytoryju SSSR za pryrodny niamiecki rynak. U źviazku z hetym — piša „Tajms" — niamieckija palityki zusim pavažna havorać ab paŭstańni niezaležnaj Ukrainy.

Dyplomatyčnyja pierahavory ab parazumieńni Niamieččyny z Francyjaj. Niezaležna ad stanovišča Francyi z Anhlijaj adnosna damahańniaŭ Niamieččynaj zamorskich kalonijaŭ adbyvajucca dyplomatyčnyja pierahavory ab parazumieńni Francyi z Niamieččynaj. Dyplomatyčnyja adviedziny i vietlivyja haściny niamieckich i francuskich palitykaŭ dajuć padstavu spadziavacca, što miž Francyjaj i Niamieččynaj nastupić palityčnaja zhoda, tak, jak naładžana miž Niamieččynaj i Anhlijaj—vyrašańnia sporaŭ biez vajny.

Polska-saviecki dahavor ab nienapadańni pradoŭžany da 1945 hodu. Zaklučany ŭ 1932 h. miž Polščaj i SSSR dahavor ab nienapadańni, jaki ŭ 1934 h. pradoŭžany da 31 śniežnia 1938 h., hetymi dniami pradoŭžany da 1945 hodu.

Vilenskaja chronika.

Kaladnyja feryi ŭ škołach buduć tryvać ad 23.XII da 9.I.

20-yja ŭhodki „Samoobrony Litwy i Białorusi". U Vilni 10 i 11 h. m. maje adbycca ŭračystaść 20-cihodździa „Samoobrony Litwy i Białorusi". Maje jana adbycca pad protektaratam Prezydenta Rečypaspalitaj praf. I. Maścickaha i maršała E. Rydza-Śmihłaha.

Likvidacyja pravasłaŭnaj patryjaršaj parachvii. Ad času paŭstańnia aŭtokefali Pravasłaŭnaj Carkvy ŭ Polščy ŭ Vilni zaisnavała pravasłaŭnaja patryjaršaja parachvija, jakaja nie padparadkavałasia novaj carkoŭnaj uładzie. Hetymi dniami henaja parachvija źlikvidavana akančalna.

Paštovaja skrynka

J. Č. Nadrukavali, ale ad nadrukavanaha astałosia tolki biełaje miesca. Hrošy (7 zał.) atrymali, dziakujem.

P. S. častku drukujem, reštu na druhi raz pakidajem.

A. O. Drukujem i dalej budziem drukavać.

J. B. Nadrukujem u numary nastupnym.

B. S. Knižka najlepšy pryjaciel.

A. Z. Chočačy, załatoŭku na hazetu zaŭsiody možna znajści.

U. V. Dobra, achvotna heta zrobim.

Z. D. I my dzivimsia z tych ludziej, što majuć asablivuju achvotu kusacca; vidać, heta ŭ ich takaja ŭžo chvaroba.

A. S. Ničoha ab hetym my nia viedajem.

B. J. Na viestki čakajem, viačary doŭhija, pišycie i prysyłajcie!

A. Ch. Choć i paciarpicio, ale budziecie viedać, za što.

K. A. Usio zroblena pavodle Vašaj voli.

Padpiska na „Chr. Dumku" na hod —4 zał., na paŭhodu— 2 zał. na try miesiacy — 1 zał. Cana asobnaha numaru — 10 hr.
Adrys Redakcyi i Administracyi: Vilnia (Wilno), Zavalnaja vul. № 1—2.

Redaktor W. JERMAŁKOWICZ
Рэдактар В. ЕРМАЛКОВІЧ

Wydawca KS. AD. STANKIEWICZ
Выдавец КС. АД. СТАНКЕВІЧ

Drukarnia Białoruska im. Fr. Skaryny, Wilno, Zawalna 1. — Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная 1